Modern History Archives
F1172 H15

# Навіны
БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА ФРОНТУ "АДРАДЖЭНЬНЕ"

нумар 2 (19) | люты 2000 г.

## Кроніка

### Акцэнт на вулічныя акцыі

12 лютага адбыўся Сойм БНФ «Адраджэньне». Асноўнымі пытаньнямі ў парадку дня Сойму былі - аб палітычнай сытуацыі (з дакладамі выступілі Валянцін Голубеў, Юры Хадыка й Вінцук Вячорка) і аб падрыхтоўцы «Вясны — 2000» (Вячаслаў Сіўчык, Віктар Івашкевіч).

Намесьнік старшыні БНФ Вячаслаў Сіўчык зазначыў, што так актыўна не рыхтавалася яшчэ ніводная вясна і выказаў спадзяваньне, што акцыі 15 і 25 сакавіка закладуць добры грунт для акцыі, якая мусіць стаць найбуйнейшай увесну - Чарнобыльскаму Шляху. Як адзначалася на Сойме, адна з асноўных задачаў Фронту на час «Вясны - 2000» - згуртаваць усе незалежніцкія сілы вакол акцыі 25 сакавіка, калі будзе адзначацца Дзень Волі. Акцыя мусіць мець агульнанацыянальны характар.

БНФ будзе прытрымлівацца рашэньня, прынятага кіраўнікамі дэмакратычных партыяў, паводле якога ўсе акцыі Вясны ёсьць агульнымі акцыямі апазыцыі (ня гледзячы на тое хто іхны заяўнік і арганізатар).

На Сойме было вызначана, што спраўдзіла сябе тактыка непасыланьня назіральнікаў на мясцовыя выбары, якія ў выніку не былі прызнаныя міжнароднай супольнасьцю. Сойм рэкамэндаваў мясцовым структурам БНФ не аддаваць сьпісы сваіх актывістаў ніякім рухам, арганізацыям, а заставацца толькі ў дысцыплінарных межах БНФ. Два гады таму была створаная «Беларуская ініцыятыва» — поле ўзаемадзеяньня 5-і вядучых партыяў для арганізацыі назіраньня за выбарамі. Палітычныя партыі, сярод якіх і Партыя БНФ, будуць вырашаць у рамках «Беларускай ініцыятывы» як і куды пасылаць назіральнікаў.

На Сойме быў вельмі высока ацэнены ўчынак афіцэра міліцыі Алега Батурына. Было сьцьверджана, што БНФ зробіць усё, каб забясьпечыць і яго, і ягоных блізкіх ад магчымых рэпрэсіяў з боку рэжыму. Адзначалася, што ягоны мужны ўчынак — заклік да іншых афіцэраў міліцыі выступіць супраць парушэньняў закону і правоў чалавека, якія чыніць рэжым, што гэты заклік будзе пачуты сумленнымі афіцэрамі міліцыі, якія не дапусьцяць сілавога супрацьстаяньня і правакацыяў з боку рэжыму. Дарэчы, у дзень правядзеньня Сойму Фронт паўдзельнічаў у вырашэньні лёсу брата Алега Міхала Батурына. Супольнымі намаганьнямі БНФ, «Хартыі'97», Кансультацыйна-наглядальнай групы АБСЭ і шэрагу замежных амбасадаў яны дастаўлены ў бясьпечнае месца за межамі дасягненьня беларускага кіроўнага рэжыму. Больш падрабязна пра сытуацыю з братамі Батурынымі чытайце на стар. 3




# Вясна-2000

Прэс-канфэрэнцыя лідараў вядучых дэмакратычных партый, рухаў і прафсаюзаў, палітыкаў «новай хвалі» адбылася 18 студзеня ў Менску.

«Сямёрка», што абвясьціла першы «Марш Свабоды» летась, павялічылася да васьмі чалавек - у яе ўвайшоў намесьнік старшыні Аб'яднанай грамадзянскай партыі Аляксандар Дабравольскі. У сьвятле далейшай кансалідацыі маладых лідараў у дзеяньні, падкрэсьліў вядучы, гэта нядзіўна. І гэта не мяжа.

Прэс-канфэрэнцыю адкрыў старшыня БНФ «Адраджэньне» Вінцук Вячорка, які старшынствуе на паседжаньнях Каардынацыйнай рады дэмакратычных сілаў:

— Новы 2000 год сканчае другое тысячагодзьдзе. І ў нас ёсьць толькі адзін год, каб зьмяніць жыцьцё ў краіне. Бо як у новае тысячагодзьдзе сустрэнеш, так яго і і правядзеш. Мы паставілі мэтай увайсьці ў новае тысячагодзьдзе без дыктатуры, вайсьці вольнай і незалежнай краінай.

Масавымі акцыямі мы хочам паказаць усяму сьвету, што ў нас ёсьць воля і рашучасьць адстаяць вольнасьць і незалежнасьць Беларусі. У сакавіку адбудзецца дзьве буйныя акцыі: 15 Сакавіка - «Марш Свабоды-2», 25 сакавіка - Дзень Волі. Гэта пачатак «Вясны-2000», якая прывядзе нас да перамогі.

Старшыня Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Народная Грамада) Мікалай Статкевіч адзначыў, што рэальнай аб'яднаньне дэмакратычных сілаў адбылася - гэта факт. І тое, што атрымалася зрабіць 17 кастрычніка, яшчэ болей садзейнічала кансалідацыі. Усе акцыі гэтай вясны, у тым ліку і тыя, што лічыліся аднапартыйнымі, усе яны будуць праводзіцца сумесна, усе будуць каардынавацца, усе пройдуць пад лёзунгамі незалежнасьці Беларусі. Статкевіч не раскрыў пакуль плянаў на красавік, але паабяцаў зрабіць гэта пазьней.

Актывіст «Хартыі'97» Зьміцер Бандарэнка спыніўся на дэталях «Маршу Свабоды-2»:

— «Марш Свабоды» адбудзецца 15 сакавіка па рашэньні Каардынацыйнай рады дэмакратычных сіл. 15 сакавіка - Дзень Канстытуцыі, дзяржаўнае сьвята. Улады ня маюць права адмаўляць у правядзеньні акцыі ў гэты дзень.

Заяўка на правядзеньне акцыі будзе пададзена крыху пазьней. Яе могуць падпісаць да ста чалавек, вядомых па ўсёй краіне.

Працяг на стар. 3

vytoki.net

# Вінцук ВЯЧОРКА:
# «Ад Коласа да Купалы праз Перамогу»

13 лютага ў штаб-кватэры БНФ «Адраджэньне» на чале з акадэмікам Міжнароднай акадэміі навук Эўразіі Анатолем Грыцкевічам адбылося першае пасяджэньне Нацыянальнага арганізацыйнага камітэту па сьвяткаваньні 25 сакавіка Дня Волі.

Удзельнікі пасяджаньня ўзгаднілі тэкст звароту аб сьвяткаваньні Дня Волі, азначылі, што сьвяткаваньне мусіць ня зводзіцца да адной акцыі, а быць сапраўды агульнацыянальным. На гэтым жа пасяджаньні была агучана праграма сьвяткаваньня Дня Волі у беларускай сталіцы, якая павінна пачацца з шэсьця па прасьпекце Францішка Скарыны, ці, як яго назваў старшыня БНФ «Адраджэньне» Вінцук Вячорка — «Ад Коласа да Купалы праз Перамогу».

У інтэрвію «Навінам БНФ» старшыня Фронту камэнтуе сэнс скліканьня Нацыянальнага камітэта і асаблівасьці сьвяткаваньня Дня Волі ў гэтым годзе:

— Сёлетняя палітычная вясна, «Вясна-2000» адрозьніваецца ад папярэдніх палітычных кампаніяў. Так у нас неяк вялося, што 15 сакавіка Дзень Канстытуцыі традыцыйна болей адзначалі прадстаўнікі Аб'яднанай грамадзянскай партыі, 25 сакавіка - чамусьці і нажаль лічылася прэрагатывай БНФ «Адраджэньне», 1 траўня - сацыял-дэмакраты ўшаноўвалі сваімі сацыяльнымі лёзунгамі. Сёлета, і гэта была вельмі прынцыповая навацыя, усе ключавыя даты веснавога палітычнага каляндара будуць адзначацца кааліцыйна. І нам, як носьбітам нацыянальнай ідэі, прыхільнікам незалежніцкага выбару, асабліва важна, што 25 сакавіка стасцца і на словах, і на справе сьвятам агульнанацыянальным. Да адзначэньня гэтай даты далучаюцца асноўныя палітычныя партыі, прафсаюзныя саюзы, грамадзкія арганізацыі і гэтую справу вітае, я спадзяюся, незалежная прэса. У дацэ 25 сакавіка чэрпаюць натхненьне і палітыкі, бо з 25 сакавіка пачалася сапраўдная беларуская палітыка: і прафсаюзныя дзеячы, бо у першых устаўных граматах БНР 25 сакавіка 1918 г. былі абвешчаныя цяпер звычайныя, а тады новыя сацыяльныя вымаганьні; і грамадзкія дзеячы выдатна ведаюць, што з 25 сакавіка пачаўся адлік сапраўднай грамадзка-культурнай працы ў беларусаў.

Палітычны сэнс таго, што адбылася першая зборка Нацыянальнага аргкамітэту за паўтара месяцы да 25 сакавіка - сьведчыць, што мы больш прафэсыйна падыходзім да рыхтаваньня акцыяў. Трэба мець дастаткова часу. Заўважна, што акцыя 15 сакавіка - Марш Свабоды-2 таксама была заанансаваная задоўга да самога гэтага дня.

Што адбудзецца 25 сакавіка. Сёньня мы дамовіліся, што будзе падавацца заяўка ў Менгарвыканкам з просьбай даць дазвол на шэсьце ад пляцу Якуба Коласа да гайку Янкі Купалы, дзе адбудзецца і палітычная імпрэза, і рок-канцэрт, і іншыя фэставыя імпрэзы. Гэта будзе шэсьце ад Коласа да Купалы праз Перамогу. Гэта адна з матывацыяў выбару такога маршруту, але, зразумела, вельмі істотна тут, што мы падкрэсьліваем: у сьвяточны дзень маем права выйсьці на галоўную вуліцу беларускае сталіцы.

Але сьвяткаваньне не абмяжоўваецца толькі сталіцаю. На 15 сакавіка Марш Свабоды - гэта будзе акцыя менская і мы на яе клічам людзей з усёй Беларусі, хто зможа пад'ехаць. А 25 сакавіка - іншая канцэпцыя. Усюды, дзе гэта магчыма, па ўсёй Беларусі а 12 гадзіне будуць зладжаныя маршы, канцэрты, пікеты і іншыя акцыі.

На 26 сакавіка, тут у нашыя сьвяточныя разважаньні ўрываецца такая змрочная нота, будуць выбары ў Расеі, хутчэй за ўсё будзе выбраны Уладзімер Пуцін, чалавек, які палітычны капітал сабе зaваяваў на чачэнскай вайне. Нямала не сумняваемся, што сярод трох задачаў, якія Пуцін мог бы выканаць каб свой рэйтынг яшчэ больш узвысіць — перамагчы ў Чачні, падвысіць дабрабыт свайго народу і уінтэграваць Беларусь - найбольш яму будзе здавацца выканальнай трэцяя. Таму будуць, непазьбежна будуць чарговыя захады, фактычныя і прапагандовыя, у рамках так званай Саюзнай дамовы. Вось чаму загадзя, ужо 15 сакавіка на Маршы Свабоды беларусы павінны выявіць ня толькі волю да свабоды і мірнага пераходу ад дыктатуры да дэмакратыі, але й волю да незалежнасьці. І апатэозам волі да незалежнасьці павінна стаць 25 сакавіка — адна з найбольш масавых акцыяў у гэтым палітычным годзе.



Кроніка

# Адміністрацыя Ленінскага р-ну не дазволіла сустрэчу жыхароў зь Вінцуком Вячоркам

24 сьнежня 1999 г. да кіраўніка адміністрацыі Ленінскага раёну г. Менску Валерыя Мяца зьвярнуліся прадстаўнікі Сьвіслацкай рады БНФ. Франтаўцы прасілі даць дазвол на сустрэчу кіраўніка БНФ Вінцука Вячоркі з жыхарамі Ленінскага раёну.

Старшыня райвыканкаму згоду даў, і сказаў, што сам гатовы ўдзельнічаць у такой сустрэчы. Сьвіслацкая рада аддрукавала адпаведныя запрашэньні-улёткі. Праз два тыдні старшыня Рады Алена Леванкова, як і было дамоўлена, зноў прыйшла на прыём да кіраўніка адміністрацыі раёну. Аднак гэтым разам сп. Мяц паводзіў сябе па-іншаму: размаўляў вельмі рэзка, казаў, што ніякага дазволу на сустрэчу жыхароў зь Вінцуком Вячоркам не даваў, і таму сустрэчы ня будзе, і ўрэшце заявіў: «Можаце зьбірацца сабе на Бангалоры».

Такім чынам, сп. Мяц сам вырашыў за жыхароў Ленінскага раёну, якія ўжо не аднойчы прасілі кіраўніцтва Сьвіслацкай рады БНФ наладзіць сустрэчу зь Вячоркам, - з кім і дзе ім можна сустракацца.

БНФ ідзе на кантакт зь людзьмі і выступае за адкрытую дзейнасьць. Сьвіслацкая рада мае шчыльныя стасункі з жыхарамі раёну і займацца мясцовымі праблемамі. Да прыкладу, калі зачыняўся 8-ы маршрут аўтобусу, прадстаўнікі Сьвіслацкай рады сабралі 500 подпісаў, і маршрут удалося захаваць. Рада дамагалася таксама адкрыцьця міні-рынку, якога раней у раёне не было.

*Прэсавая служба БНФ «Адраджэньне»*

vytoki.net

# Батурыны абвінавачваюць МУС

**10 лютага ў газэце «Народная воля» быў зьмешчаны адкрыты ліст за подпісам Алега Батурына, старшага інспэктара групы забесьпячэньня Галоўнай управы кадраў МУС. Афіцэр міліцыі распавядаў пра тое, як уладамі былі справакаваныя сутычкі з дэманстрантамі падчас Маршу Свабоды ў Менску 17 кастрычніка 1999 г. Аўтар ліста заклікаў афіцэраў міліцыі адкрыта выступіць супраць рэжыму Лукашэнкі.**



• *Міхал Батурын зь нявестай*

У гэты ж дзень каля 15.00 двое невядомых, што прадставіліся супрацоўнікамі міліцыі, напалі на яго старэйшага брата Міхала. Гэтыя асобы гвалтоўна выбівалі з хлапца пісьмовую заяву, што Алег зьяўляецца псыхічна хворым. Міхалу ўдалося вырвацца, ён забраў з працы сваю нявесту Натальлю і прыехаў у офіс БНФ «Адраджэньне» па падтрымку. Была склікана тэрміновая прэсавая канфэрэнцыя, дзе Міхал распавёў пра здарэньне.

Ён не сумняваецца ў псыхічным здароўі свайго малодшага брата, які зьяўляецца афіцэрам міліцыі і рэгулярна праходзіў медычныя агляды.

Пра падрыхтоўку публікацыі ў «Народнай волі» старэйшы брат нічога ня ведаў, але поўнасьцю падтрымлівае малодшага. Міхал ня ведае, дзе зараз знаходзіцца Алег, але перакананы, што на волі і ў надзейным месцы. Што рабіць самому — Міхал ня ведаў, таму і зьвярнуўся ў офіс вядомай апазыцыйнай арганізацыі.

Намесьнік старшыні Беларускага Хельсынскага камітэту Гары Паганяйла пераканаў Міхала напісаць заяву ў пракуратуру, зь якой і накіраваўся па інстанцыям. Міхала ж і яго нявесту апазыцыянэры даставілі ў «надзейнае месца».

БНФ вітае мужны крок Алега Батурына і заяўляе, што зробіць усё магчымае, каб абараніць афіцэра міліцыі й ягоных родных ад рэпрэсіяў з боку рэжыму.

БНФ перакананы, што ўчынак афіцэра паслужыць прыкладам для ягоных калег, якія не дапусьцяць правакацыяў з боку уладаў падчас масавых акцыяў Вясны - 2000.



# Вясна-2000

*Пачатак на стар. 1*

Маршрут «Маршу» - ад плошчы Якуба Коласа да плошчы Незалежнасьці, як і трэба пад час любога дзяржаўнага сьвята.

Мэтай «Маршу» ёсьць падтрымка перамоўнага працэсу паміж уладамі і апазыцыяй пра пасярэдніцтве АБСЭ. А таксама, безумоўна, абарона незалежнасьці Беларусі.

Мы перакананыя ў тым, што ў акцыі прыме ўдзел людзей ня меней, чым у першым «Маршы». І як раней разьлічваем на 100-тысячную акцыю.

Першы намесьнік старшыні Вярхоўнага Савету XIII скліканьня Анатоль Лябедзька паведаміў, што першая «прэзэнтацыя» «Маршу Свабоды-2» адбылася 13-14 студзеня ў Вене пад час паседжаньня камітэту Парлямэнцкай Асамблеі АБСЭ ў прысутнасьці прадстаўнікоў 55 нацыянальных парлямэнтаў, дзе ён знаходзіўся ў складзе беларускай парлямэнцкай дэлегацыі, а таксама пад час асабістых сустрэч з вышэйшымі асобамі АБСЭ. Ёсьць дамоўленасьць, што для назіраньня за «Маршам» прыедуць парлямэнтары краінаў-суседзяў Беларусі - Літвы, Польшчы, Украіны, Расеі. Ёсьць верагоднасьць, што ў гэтыя дні ў Менску будзе знаходзіцца галоўны чыноўнік, які адказвае ў АБСЭ за Беларусь - Адрыян Севярын. На «Марш» будуць запрошаныя таксама прадстаўнікі праваабарончых міжнародных арганізацый. На наступным тыдні Анатоль Лябедзька ў якасьці главы беларускай дэлегацыі будзе ўдзельнічаць ў працы Парлямэнцкай Асамблеі Рады Эўропы, дзе таксама будзе абмяркоўвацца беларускае пытаньне. Там таксама будзе распаўсюджаная інфармацыя пра правядзеньне «Вясны-2000» і «Маршу Свабоды».

«Наш лёзунг на гэту вясну, - падкрэсьліў Лябедзька, - ПЕРАМОВЫ, ПЕРАМЕНЫ, ПЕРАМОГА!»

Эканамічная сытуацыя ў Беларусі рэзка пагоршылася. Людзі галеюць. Таму акцыі «Вясны-2000» будуць падтрыманыя страйкамі прадпрымальнікаў і прадпрыемстваў Беларусі ў абарону сваіх правоў, заверыў прысутных намесьнік старшыні БНФ «Адраджэньне» Віктар Івашкевіч.- Пачынаючы зь лютага, страйкавы рух у краіне будзе набіраць сілу.

Удзельнікі прэс-канфэрэнцыі неаднаразова падкрэсьлівалі, што канчатковай мэтай хвалі масавых акцый і міжнароднага ціску на рэжым зьяўляецца арганізацыя перамоваў. Толькі ў выніку пермоваў можа быць выпрацаваны выбарчы кодэкс, згодна зь якім адбудуцца парлямэнцкія выбары. Выбары павінны адбывацца пад строгім наглядам міжнародных структур. Толькі на гэтых умовах дэмакратычныя сілы пойдуць на выбары.

Выбары па кодэксу, што прыняты ў абыход перамоваў - фарс. Калі ня будзе перамоўнага працэсу, ня будзе сумленных выбараў. Гэта, у сваю чаргу, азначае, што з боку міжнароднага супольніцтва будуць уведзеныя санкцыі супраць Беларусі як супраць недэмакратычнай краіны. Менавіта пра гэта ішла размова ў рэзалюцыі ПА АБСЭ, за якую ў Вене прагаласавалі прадстаўнікі 51 краны Эўропы. Пры гэтым ёсьць інфармацыя, што некаторыя краіны ўжо гатовыя не прызнаваць ні главу дзяржавы, ні парлямант, абраныя ў выніку недэмакратычных выбараў.

«Пасьля рэфэрэндуму 1996 году мы ня можам абіраць, — сказаў Павел Данэйка. - Тыя выбары, што зьбіраюцца праводзіць сяньня ўлады, не азначаюць права грамадзянаў на выбары. Нашы грамадзяне ня маюць магчымасьці выбару. Мы жадаем дамагчыся менавіта права свабодна выбіраць. Менавіта з гэтага пачынаецца дэмакратыя».



vytoki.net

# Заява Кансультацыйнай рады апазыцыйных палітычных партый

Ухваляючы высілкі АБСЭ па рашэньні ў Беларусі канстытуцыйнага і палітычнага крызісу праз перамовы аб паўнамоцтвах будучага парляманту, выбарчым заканадаўстве і правядзеньні вольных выбараў,

Канстатуючы, што Лукашэнка і так званая «Палата прадстаўнікоў», што ўзурпавалі ўладу ў краіне, вырашылі ў аднабаковым парадку, без узгадненьня з палітычнай апазыцыяй, прыняць заканадўства, якое вызначае арганізацыю і правядзеньне выбараў у марыянэткавую «Палату прадстаўнікоў»,

Канстатуючы, што спадар Лукашэнка заблякаваў парафаваны бакамі пры пасярэдніцтве АБСЭ «Пратакол узгадненьня ўмоваў доступу палітычнынай апазыцыі да дзяржаўных СМІ:..»,

Прымаючь на ўвагу, што спадаром Лукашэнкам груба парушаныя ўзятыя на сябе абавязкі па Санкт-Пецярбугскай рэзалюцыі ПА АБСЭ, а таксама пункт 22 Стамбульскай дэкляраціі, і што ім жа ў 1997 годзе былі сарваныя перамовы, якія ініцыявалі Эўрапейскі Зьвяз і Рада Эўропы,

Канстатуючы, што ўладай праігнараваныя заклікі да ўсталяваньня ў краіне палітычнага клімату, вольнага ад страху і палітычных перасьледаў, ня вызвалены палітычныя вязьні, не прынятыя належныя меры па пошуку зьніклых буйных дзеячоў апазыцыі Віктара Ганчара і Юрыя Захаранкі,

Вельмі занепакоеныя станам у краіне грамадзянскіх правоў і свабодаў, паглыбленьнем эканамічнага крызісу, міжнароднай ізаляцыяй і падзеньнем узроўня жыцьця насельніцтва краіны,

Кансультатыўная Рада апазыцыйных палітычных партый

Пацьвярджае сваю гатоўнасьць шукаць выйсьце зь існуючага эканамічнага, палітычнага і канстытуцыйнага тупіка шляхам перамоваў аб аднаўленьні канстытуцыйнага палажэньня па допуску да дзяржаўных СМІ, пра паўнамоцтвы будучага парляманту, пра прыняцьцё справядлівага выбарчага закону, пра правядзеньне пад унутраным і міжнародным кантролем парлямэнцкіх і прэзыдэнцкіх выбараў,

Заяўляе, што прыняцьце выбарчага закону па-за перамоўным працэсам і захаваньне атмасфэры гвалту ператворыць такія выбары ў фарс, і апазыцыя ня будзе прымаць у іх удзел.

*Прынята на паседжаньні КР АПП 11.01.2000*
*Старшыня С. БАГДАНКЕВІЧ*

# Дадатак

*Пералік асноўных палітычных пытаньняў, што адносяцца да выбараў, якія павінны быць вырашыя ў цягу перамоваў і рэалізаваныя ў законах краіны да пачатку абвяшчэньня перадвыбарчай кампаніі.*

Толькі з гэтай умовай можна разьлічваць на правядзеньне ў Беларусі дэмакратычных, без фальсыфікацыі, свабодных выбараў і абраньне легітымнага парляманту, якога прызнае як беларуская грамадзкасьць, так і міжнародная супольнасьць.

## Паўнамоцтвы парлямэнту

Парлямэнт краіны павінен зьяўляцца адзіным заканадаўчым органам, адзіным тлумачальнікам законаў, быць надзеленым функцыямі кантролю за іх выкананьнем, рэальна ўдзельнічаць у фармаваньні ўраду і кантролі за ягонай дзейнасьцю.

Кансультатыўная Рада выступае за стварэньне аднапалатнага парляманту, які фармуецца па мяшанай сыстэме (50% — па партыйных сьпісах, 50% — па акругах). Увядзеньне выбарчага бар'еру ў 3-5% і, магчыма, выбарчага закладу. У выпадку дасягненьня дамоўленасьці пра фармаваньне двухпалатнага парляманту - абедзьве палаты павінны абірацца насельніцтвам шляхам простых выбараў. Дапушчальныя выбары ў адзін тур па прынцыпу адноснай большасьці.

## Выбарчы працэс

1. Гарантаваць усім палітычным партыям свабодны доступ на тэлебачаньне, радыё і да масавых газэт для выкладаньня сваіх плятформаў, эканамічных праграмаў, адносінаў да падзеяў. У гэтых мэтах магчымае стварэньне Грамадзкай назіральнай рады.

2. На час перадвыбарчых кампаній непасрэдна ў законе аб выбарах заклaсьці мэханізм шырокага і роўнага доступу партый і кандыдатаў да СМІ, у тым ліку і да мясцовых, а таксама правядзеньня без папярэдніх дазволаў агітацыйных мерапрыемстваў (мітынгі, пікеты, сходы, сустрэчы ў дварах, абыход кватэраў і г.д.). Заканадаўства не павінна мець аніякіх забаронаў і абмежаваньняў на правядзеньне перадвыбарчай агітацыі, а таксама адсылак на іншыя законы.

3. Забясьпечыць плюралістычны склад і поўную незалежнасьць ад улады выбарчых камісій. Органы ўлады («партыя ўлады») не павінны мець перавагі перад іншымі структурамі грамадзянскай супольнасьці. У Цэнтральнай выбарчай камсіі павінны быць асноўныя плітычныя партыі і грамадзкія арганізацыі, якія займаюцца пытаньнямі выкананьня грамадзянскіх свабодаў. Іншыя зацікаўленыя партыі і арганізацыі павінны мець права на атрыманьне статусу назіральнікаў з правам дарадчага голасу. Падобнае прадстаўніцтва павінна быць гарантавана ў складзе рэгіянальных і мясцовых выбарчых камісіяў. Незалежныя кандыдаты ў дэпутаты павінны мець права накіроўваць у выбарчыя камісіі, акругі сваіх прадстаўнікоў.

4. Не дапускаць дыскрымінацыйных палажэньняў, што абмяжоўваюць правы палітычных партый у выбарчым працэсе. Урэгуляваць пытаньне рэгістрацыі партыйных структураў на месцах. Увесьці ўведамляльны парадак уліку партыйных структураў (магчыма, у акруговых выбарчых камісіях).

5. Надзяліць правам вылучэньня кандыдатаў у дэпутаты толькі партыі, выбарчыя блёкі і грамадзянаў шляхам збору подпісаў. Максымальна спрасьціць парадак збору подпісаў выбаршчыкаў. Падставай для адмовы ў рэгістрацыі кандыдата, які зьбірае подпісы, можа быць толькі недастатковая колькасьць сабраных подпісаў. Нельга адмаўляць у рэгістрацыі кандыдатам, якія знаходзяцца пад сьледзтвам ці маюць адміністратыўныя ўзысканьні, што наклаў суд. Лішэньне зарэгістраванага кандыдата ў дэпутаты ягонага статусу дазваляецца толькі па рашэньні суду. Выдаткі на вядзеньне выбарчых кампаній рабіць з выбарчых фондаў, улічваючы як бюджэтныя асыгнаваньні, так і добраахвотныя ахвяраваньні.

6. У адпаведнасьці з Канстытуцыяй лічыць выбары адбыўшыміся пры любой колькасьці прагаласаваўшых. У якасьці кампрамісу магчыма ўсталяваньне парогу прыходу выбаршчыкаў да 25% у першым туры пры адмене парогу зьяўленьня ў другім туры.

7. Строга рэглямэнтаваць галасаваньне ў хаце і замяніць сыстэму датэрміновага галасаваньня сыстэмай адкрапляльных пасьведчаньняў.

8. Замацаваць непасрэдна ў законе статус, правы і абавязкі грамадзкіх і міжнародных назіральнікаў, у тым ліку правы на ўдзел ва ўсіх паседжаньнях камісіяў і права на атрыманьне завераная копіі пратаколаў, што складае камісія.

9. Уключыць у выбарчы закон нормы ўспростага дзеяньня аб адказнасьці за яго парушэньне, у тым ліку за парушэньне правоў партыяў, кандыдатаў у дэпутаты, назіральнікаў і выбаршчыкаў.

*Прынята на паседжаньні КР АПП 11 .01.2000*
*Старшыня С.БАГДАНКЕВІЧ*


vytoki.net

# Актывіст "Маладога Фронту" затрыманы ў ходзе правядзеньня ў Гародне акцыі, прасьвечанай гадавіне з Дня нараджэньня К. Каліноўскага

Адзін з актывістаў "Маладога Фронту" 2 лютага затрыманы і дастаўлены ў Ленінскі РАЎС Гародні. Так скончылася акцыя, праведзеная ў абласным цэнтры актывістамі гэтай маладзёжнай арганізацыі. Акцыя прысьвячалася 162-й гадавіне з Дня нараджэньня Кастуся Каліноўскага.

Надпіс на плякаце нагадваў, што яшчэ дзесяць год таму ўлады павінны былі ўстанавіць у горадзе помнік палымянаму рэвалюцыянэру, нацыянальнаму герою Беларусі. У свой час такая ініцыятыва грамадзкасьці шырака абмяркоўвалася ў мясцовым друку і была падтрыманая рашэньнем ЦК КПБ "Об установлении в Гродно памятника революционеру-демократу К.Калиновскому". Грамадзяне рэспублікі ахвяравалі для гэтага 10 тысяч рублёў. Немалыя на той час грошы аселі на рахунках установаў культуры. Хуткім часам КПБ-КПСС сышла з палітычнай арэны. Аднак рашэньне Гарадзенскага гарвыканкаму аб выдзяленьні для помніка ўчастку каля будынку аблсаўпрофу па вуліцы Савецкай застаецца дзейсным. Дарэчы, побач знаходзіцца дом, дзе была канспіратыўная кватэра паўстанцаў, і Каліноўскі праводзіў нарады з камандзірамі паўстанцаў. Як раз на месцы помніка і правялі сваю несанкцыянаваную акцыю "маладафронтаўцы". Да гэтага яны ўсклалі кветкі каля мэмарыяльнай дошкі на будынку чыгуначнага вакзалу ў памяць аб паўстанцах, якія 14 сакавіка1863 году ўступілі ў бой з царскай паліцыяй. На затрыманага ўдзельніка акцыі ў міліцыі складзены пратакол аб правапарушэньні.

# Пад час пікету ў Барысаве былі затрыманыя лідэры мясцовых дэмакратычных арганізацыяў

16 студзеня актывісты дэмакратычных арганізацыяў Барысава правялі несанкцыянаваны пікет. На цэнтральны пляц гораду (за 30 мэтраў ад гарадзкога выканаўчага камітэту) выйшлі каля дзесяці чалавек, каб выказаць пратэст супраць парушэньня правоў чалавека ў краіне і зьвярнуць увагу людзей на палітычны працэс над Міхаілам Чыгірам.

Пікет праводзілі разам мясцовыя арганізацыі БСДП (НГ), БНФ "Адраджэньне" і БСДГ. Людзі трымалі ў руках плякаты "Рукі прэч ад Чыгіра!", "Дыктатура не пройдзе!", "Захаранка, Чыгір - хто наступны?". Мінакам раздавалі газэту "Згода" і праваабарончы бюлетэнь "Права на волю."

Праз 26 хвілінаў (а для Барысава гэта рэкорд у працягласьці несанкцыянаванага пікету) да шэрагу людзей, якія стаялі пад бел-чырвона-белым сьцягам, пад'ехалі тры міліцэйскія машыны. Міліцыянты затрымалі Анатоля Аскерку (старшыню Барысаўскага БНФ), Генадзя Гаўрусева (кіраўніка мясцовай БСДГ), Аляксандра Абрамовіча (кіраўніка філіі БСДП "Народная Грамада") і сябру БСДП (НГ) Аляксандру Ясюк. У Зьмітра Абрамовіча, які зрабіў здымак моманту гвалтоўнага спыненьня пікету, "ахоўнікі парадку" паспрабавалі адабраць фотаапарат, але замест гэтага іхным трафэем стала толькі торба з газэтай "Згода".

Усіх затрыманых завезьлі ў Барысаўскі ГАЎС, дзе склалі пратаколы, і праз паўтары гадзіны выпусьцілі. Трэба сказаць, што складаў пратаколы і кіраваў затрыманьнем капітан Кірын, які ўжо ў ГАЎСе хваліўся затрыманым, што ўдзельнічаў у штурме Грозная пад час першай чачэнскай вайны, абяцаў, што Пуцін з Лукашэнкам навядуць парадак, а Анатоля Аскерку, які ў пастарунку патрабаваў перакладчыка, пагражаў выслаць у Сыбір.

# Ёсьць і перамогі

Строгае папярэджаньне ад кіраўніцтва Берасьцейскага ЎУС атрымаў намесьнік начальніка Ленінаскага райаддзелу міліцыі абласнога цэнтру Міхаіл Кергель за дзеяньні сваіх падначаленых пад час "аблавы" на ўдзельнікаў акцыі "Запалі сваю сьвечку веры і незалежнасьці" , што адбылася ў Берасьці 8 сьнежня 1999 году. Нагодай для разбіральніцтва дзеяньняў супрацоўнікаў міліцыі стала заява ад берасьцейца Рыгора Варвашэвіча, накіраваная на адрас кіраўніка ЎУС вобласьці. 8 сьнежня летась ён быў затрыманы супрацоўнікамі міліцыі для праверкі дакумэнтаў пад час распаўсюджваньня газэты Свабоднага прафсаюзу "Рабочы". 10 сьнежня участковы прынёс Р. Варвашэвічу позву з патрабаваньнем зьявіцца ў Ленінскі райаддзел міліцыі. Аднак за гадзіну да пазначанага ў позве часу за Р. Варвашэвічам прыйшлі... участковы з чатырма ўзброенымі супрацоўнікамі амону. Р. Варвашэвіча тым часам дома не было. Пазьней адносна Р. Варвашэвіча быў складзены пратакол пра адміністратыўнае правапарушэньне - за распаўсюджваньне газэты "Рабочы". Затым адбыўся суд, які прызнаў Р.Варвашэвіча невінаватым у парушэньні Кодэксу аб адміністратыўным правапарушэньні.Р. Варвашэвіч, усьведамляючы сваю праваты, накіраваў ва ЎУС Берасьцейскага аблвыканкому заяву з патрабаваньнем прыцягнуць да дысцыплінарнай адказнасьці нам. начальніка ўпраўленьня аховы грамадзкага парадку ЎУС вобласьці Сьцяпана Трубчыка Па заяве Г. Варвашэвіча было праведзена службовае расьсьледаваньне, і факты, выкладзеныя ў заяве, пацьвердзіліся Аднак вінаватым прызналі не Сьцяпана Трубчыка, а начальніка Ленінскага райаддзелу міліцыі Міхаіла Кергеля. Як паведаміў БелаПАНу Р. Варвашэвіч, сыходам расьсьледаваньня ён задаволены, але мае намер падаваць зыск у суд аб кампэнсацыі яму маральнага ўрону.

# Лідэр Сялянскай партыі заявіў аб далучэньні да БНФ

Яўген Лугін заявіў пра далучэньне Сялянскай партыі да БНФ "Адраджэньне" ў якасьці фракцыі. БНФ вітае гэты крок і спадзяецца на плённае супрацоўніцтва з новымі сябрамі руху. Кіраўніцтва БНФ заяўляе, што інтарэсы Сялянскай партыі будуць улічаныя, а досьвед запатрабаваны ў дзейнасьці шырокага руху БНФ "Адраджэньне".

# Малады Фронт заявіў аб стварэньні Цэнтру інфармацыі па Ічкерыі

Прадстаўнікі арганізацыі ставяць перад сабой на мэту распаўсюджваньне на іх пагляд праўдзівай інфармацыі, якая сталася б альтэрнатывай расейскаму афіцыёзу, што зьяўляецца адзіным пунктам гледжаньня на ўсіх каналах электронных СМІ суседняй краіны. Пакуль асноўнай крыніцай альтэрнатыўнай інфармацыяй аб падзеях у Чачні ёсьць Internet сайт <http://www.kavkaz.org>. Спадзяемся, у пэрспэктыве крыніцы здабычы зьвестак аб чачэнскай вайне значна пашырацца.

# Мінюст заўважыў "Край"

Міністэрства юстыцыі Беларусі накіравала ліст на зьмешчаны ў улётках паштовы адрас нефармальнай спартова-патрыятычнай арганізацыі "Край".

Начальнік управы грамадзкіх аб'яднаньняў Мінюсту Міхаіл Сухінін паведамляе, што яму стала вядомым, нібы гэты адрас выкарыстоўваецца арганізацыяй "Край", ва ўстаноўленым парадку не зарэгістраванай. Сп. Сухінін прапанаваў прадстаўнікам "Краю" зьвярнуцца з заявай аб рэгістрацыі ў Міністэрства юстыцыі ці Ўправу юстыцыі Менскага гарвыканкаму і нагадаў, што за дзейнасьць ад імя незарэгістраваных грамадзкіх аб'яднаньняў Адміністрацыйным кодэксам прадугледжана адказнасьць у выглядзе папярэджаньня ці штрафу.

# БНФ падтрымлівае пратэст беларускіх прадпрымальнікаў

Агульнанацыянальны страйк прадпрымальнікаў стаў вынікам палітыкі на вынішчэньне малога бізнэсу, якую праводзіць сёньняшні рэжым.

БНФ падтрымлівае беларусіх прадпрымальнікаў у іхнай справядлівай барацьбе. "Мы лічым, што прадстаўнікі малога бізнэсу павінны дзейнічаць да апошняй мяжы", -- сказаў Вячаслаў Сіўчык, намесьнік старшыні БНФ.

БНФ "Адраджэньне" зычыць беларускім прадпрымальнікам мужнасьці й рашучасьці ў іхнай справе, а таксама - салідарнасьці зь іншымі групамі насельніцтва, бо толькі супольнымі намаганьнямі можна зьмяніць сытуацыю ў грамадзтве і адстаяць незалежнасьць нашай краіны.



vytoki.net

# Расправа з журналістам

## *Канстытуцыйны парадак трэба аднаўляць не ў Чачні, а ў Маскве*

Аляксандар ПАДРАБІНЕК,
Зоя АР'ЯХАВА

Выканаўца абавязкаў прэзыдэнта Расеі Ўладзімер Пуцін апошнім часам вельмі цікавіцца праблемамі законнасьці і часта кажа ў прамовах пра неабходнасьць уладарства закону. Пачынаючы з 3 лютага 2000 году ўсім ягоным падобным словам існуе адзінае і зразумелае тлумачэньне: мана. У гэты дзень памочнік яшчэ не абранага, але ўжо кіраўніка дзяржавы Сяргей Ястаржэмбскі абвясьціў, што дзяржаўная ўлада зьдзейсьніла злачынства і здымае зь сябе за яго адказнасьць. Справа ідзе пра абмен затрыманага фэдэральнымі сіламі пры выхадзе з Грознага карэспандэнта радыёстанцыі «Свабода» Андрэя Бабіцкага на двух палонёных чачэнцамі расейскіх салдатаў. Калі, вядома, расказаная ўжо неаднойчы схлусіўшым абаронцам улады вэрсія падзеі адпавядае рэчаіснасьці, а ня мае мэтай схаваць яшчэ больш жахлівыя падзеі.


• *Андрэй Бабіцкі*

Выпадак з затрыманьнем на адным з прапускных пунктаў дарогі Грозны-Гудэрмэсператварыўся ў адну з самых драматычных журналісцкіх гісторыяў сучаснай чачэнскай кампаніі. Андрэй Бабіцкі - з тых нешматлікіх расейскіх карэспандэнтаў, што працуюць у гэтую вайну па той бок фронту. Як вядома, згодна зь дзейсным заканадаўствам, у адсутнасць надзвычайнага становішча журналіст мае права быць паўсюль, дзе ён лічыць патрэбным, і яму не патрэбны дадатковы дазвол уладаў.

> «Бабіцкі каштуе ня трох салдатаў, а трыццаці расейскіх генэралаў»

Бабіцкі зьбіраў інфармацыю без акрэдытацыі, якую выдае штаб аб'яднанай групоўкі сіл у Маздоку. 27 сьнежня Расейскі інфармацыйны цэнтар абвінаваціў яго ў супрацоўніцтве з чачэнскімі баевікамі. На пачатку студзеня гэтае імя ўпершыню стала ўзгадвацца ў кантэксьце перасьледу незалежных журналістаў расейскімі ўладамі. Праваахоўныя органы зацікавіліся нэгатывамі з чачэнскага фронту, якія зрабіў Бабіцкі і здаў у звычайнае маскоўскае фотаатэлье.

Са стужкай, аднак, нічога страшнага не адбылося: яе вярнулі жонцы Андрэя. Аднак сям'ю рэпарцёра і яго начальства на той момант значна болей хвалявала тое, што пасьля 15 студзеня ён перастаў выходзіць на сувязь з сваёй рэдакцыяй. Вядома было, што Бабіцкі павінен быў вяртацца з Чачні дадому. Было абвешчана, што журналіст зьнік бязь вестак. 27 студзеня заклапочанасьць ягоным лёсам, якая суправаджалася заклікам да расейскіх уладаў не ствараць перашкодаў для журналісцкай працы ў зоне баявых дзеяньняў, выказалі прадстаўнік па свабодзе прэсы Арганізацыі па бясьпецы і супрацоўніцтве ў Эўропе Фраймут Дувэ і афіцыйны прадстаўнік Дзяржаўнага дэпартамэнту ЗША Джэймс Рубін. У Маскву з Вашынгтону прыехаў дырэктар радыёстанцыі «Свабода» Джэф Трымбал, у мінулым маскоўскі карэспандэнт амэрыканскага часопісу U.S. News & World Report.

Толькі пасьля таго, як 28 студзеня агенцтва «Інтэрфакс» распаўсюдзіла, са спасылкай на неназваныя крыніцы, вэрсію пра тое, што карэспандэнт «Свабоды» затрыманы фэдэральнымі сіламі і што супрацьў яго узбуджана крымінальная справа за «ўдзел у незаконных узброеных фармаваньнях», радыёстанцыя «Свабода» атрымала ад Міністэрства ўнутраных спраў пацьверджаньне - хаця і вуснае: Бабіцкі затрыманы на прапускным пункце пры выхадзе з Грознага. Прагучала дата - 23 студзеня. Гэта азначала ўжо пяцідзённае трыманьне пад вартай без кантактаў з вонкавым сьветам, што незаконна ня толькі для журналістаў.

Улады, аднак, ані разу ня выказалі нават простай прысаромленасьці падобнымі абставінамі. Усё аказалася яшчэ горай. 31 студзеня Ястаржэмбскі паведаміў кіраўніцтву «Свабоды», што Бабіцкі быў затрыманы не 23, а 18 студзеня, а ордэр на арышт быў прад'яўлены 27 студзеня. Ястаржэмбскі паведаміў таксама, што ў карэспандэнта «Свабоды» знайшлі акрэдытацыю, падпісаную шэрагам камандзіраў чачэнскага штабу. Падрабязнасьць, што ня мае аніякага значэньня: хіба тая самая акрэдытацыя пры штабе ў Маздоку азначае ўдзел журналіста ў вайсковых дзеяньнях на баку Масквы.

Лідары Чачэнскай рэспублікі сапраўды маюць крыху іншую думку аб працы Бабіцкага, чым Расінфармацэнтар. 28 студзеня міністар замежных справаў Чачэнскай рэспублікі Ільяс Ахмадаў зрабіў у Вашынгтоне заяву: «Кожны тыдзень сотні людзей становяцца ахвярамі другой вайны ў Чачні. Чачэнскі ўрад не жадае, каб Андрэй Бабіцкі стаў яшчэ адной ахвярай гэтай вайны. Ягонае зьнікненьне і наступныя паведамленьні пра ягонае затрыманьне расейскімі войскамі - яшчэ адно сьведчаньне таго, што Масква працягвае жорстка абмяжо-ваць плынь інфармацыі з Чачэнскай рэспублікі. Адбудзецца трагедыя, калі Андрэй Бабіцкі стане ахвярай інфармацыйнай вайны, абвешчанай у тандэме з той, што вядзецца вайсковымі мэтадамі».

Як бы ні было, журналіста затрымалі, і пачаліся сьледчыя працэдуры, аб чым у калег са «Свабоды» ёсьць адзінае пісьмовае сьведчаньне: копіі экспэртнай высновы Музэю старажытнарускага мастацтва імя Андрэя Рублёва стасоўна каштоўнасьці забранага ў Бабіцкага абраза (экспэрты вызначылі кошт - 10 рублёў). Музей Спаса-Андронікаўскага манастыру аказаўся адзінай афіцыйнай інстанцыяй, што дала радыёстанцыі «Свабода» афіцыйны дакумэнт аб праведзеных з Бабіцкім дзеяньнях. Усе астатнія зьвесткі пра свайго супрацоўніка «Свабода» атрымлівала выключна ў вуснай форме.

Пачынаючы з 16 студзеня ніхто са сваякоў і калег журналіста ня мае пацьверджаньняў таго, што той жывы. Яму ня далі магчымасьці зьвязацца ані з адвакатам, ані зь сям'ёй, ані з рэдакцыяй. Яго ня бачыў і ня чуў аніхто са сваякоў і супрацоўнікаў. «Тое, што Ястаржэмбскі, які кожны раз кажа то адно, то другое, жывы і здаровы, — я бачу кожны дзень! А што з маім мужам — я ня ведаю!» - кажа Людміла Бабіцкая, жонка карэспандэнта. За ўвесь час яна атрымала адзіны і вельмі дзіўны званок ад афіцыйных асобаў. Чалавек, што назваўся пракурорам Наўрскага раёну Чачні, паведаміў, што муж прасіў перадаць ёй, што ён жывы і здаровы. Падрабязнасьці затрыманьня ён ёй не распавёў. «Я крычу: як, што, якая справа, якія абвінавачаньні, што зь ім? А той вельмі хутка са мной разьвітаўся, і ўсё...» - распавядае Людміла. Да вышэйсказанага застаецца дадаць, што, па сьведчаньнях «Свабоды», аніякага абвінавачаньня Бабіцкаму так і не прад'яўлена.

2 лютага паступіла паведамленьне пра тое, што карэспандэнта выпусьцілі з-за кратаў пад падпіску аб нявыезьдзе. Тым ня менш, яго месцазнаходжаньне заставалася невядомым... На наступны дзень



vytoki.net

Сяргей Ястаржэмбскі абвясьціў журналістам пра факт абмену. Ён паказаў некалькі рукапісных аркушаў, на якіх (калі яму можна верыць) была просьба чачэнскіх камандзіраў Саіда Ўсахаджаева. Хуркан-Пашы Ісрапілава і Турпал-Алі Абгірэева аддаць ім карэспандэнта «Свабоды» ў абмен на двух-трох палонных. А таксама просьбу самога Бабіцкага, які, нібыта, жадае гэтым самым аказаць паслугу Камісіі па вяртаньні незаконна ўтрымліваных вайскоўцаў. Скончыў Ястаржэмбскі жудаснай фразай: «Фэдэральны цэнтар з гэтага моманту не нясе адказнасьці за далейшы лёс Андрэя Бабіцкага».

Між тым, удзень 3 лютага віцэ-прэм'ер ураду Чачні Ваха Арсанаў катэгарычна заявіў, што ніякіх абменаў палоннымі ў апошнія суткі чачэнскі бок не рабіў. Увечары 3 лютага міністар замежных спраў Ільяс Ахмадаў паведаміў «Экспресс-Хроникс», што чачэнскі палявы камандзір Хуркан-Паша Ісрапілаў загінуў тыдзень таму ў Грозным і, такім чынам, ня мог падпісаць просьбу пра абмен Бабіцкага на ваеннапалонных. Турпал-Алі Абгірэеў заявіў, што ня ведае пра які-небудзь абмен. Хто такі Саід Усахаджаеў, увогуле невядома. Сп-р Ахмадаў таксама паведаміў, што большыня дзейсных палявых камандзіраў заявілі, што такога абмену не было і быць не магло. «Яны надта танна ацанілі яго, — сказаў адзін зь іх. - Бабіцкі каштуе ня трох салдатаў, а трыццаці расейскіх генэралаў».

4 лютага тэлебачаньне паказала зьнятую ФСБ відэастужку абмену Бабіцкага на салдатаў. З чачэнскага боку ўсе былі ў масках, і быць перакананым, што гэта чачэнцы, а не эфэсбэшнікі, немажліва. Спадзеву на тое, што Андрэй Бабіцкі яшчэ жывы, зусім мала. Органы юстыцыі ці тупа маўчаць, ці прыдумваюць адну малапераканаўчую хлусьню за другой, увачавідкі спрабуючы сысьці ад цяжкой адказнасьці.

Такім чынам, з поўным правам можна канстатаваць, што прававой дзяржавы Расеі не існуе. Ня трэба быць юрыстам, каб зразумець, што дзеяньні Масквы знаходзяцца па-за рамкамі закону. Аніводная норма расейскага права нават прыблізна не дазваляе мяняць адных расейскіх грамадзянаў на другіх, а тым болей органам улады сьпісваць зь сябе адказнасьць за жыцьцё грамадзяна.

«Апэрацыя» з Андрэем Бабіцкім, праведзеная на вачох усяго сьвету, нагадвае пачварную і бяздарную гэбісцкую правакацыю. Як выклік праву, як плявок у твар грамадзтву, як пагроза на будучае. Крэмль прадэманстраваў свой уласны мэтад кіраваньня - заснаваны на перавазе сілы, бессаромнай хлусьні і грэбаваньні наваколь-нымі. Па сутнасьці, гэта ні што іншае, як тэрарызм. Тэрарызм значна больш небясьпечны, чым той, супраць якога, нібыта, змагаецца на Паўночным Каўказе Расея. Міжнароднаму супольніцтву варта зьвярнуць увагу на гэтыя абставіны.

*Паводле расейскага праваабарончага тыднёвіка "Экспресс-хроника", 7 лютага 2000 г.*



# Расейскія салдаты гвалцяць чачэнскіх жанчын

**Расейскія салдаты гвалцяць чачэнскіх жанчын на тэрыторыях, якія падкантрольныя фэдэральным войскам. З такімі абвінавачаньнямі выступіла ўплывовая міжнародная праваабронча арганізацыя Human Rights Watch.**

«Гвалт гэта вcase злачынства, і заявы пра гвалт у Чачні вельмі сур'ёзныя»- кажа Рэган Ральф, выканаўчы дырэктар аддзелу HRW па назіраньні за правамі жанчын. Яна падкрэсьлівае, што, згодна міжнароднаму праву, кожны адзінкавы выпадак такога кшталту ёсьць ваеным злачынствам.

Назіральнікі HRW у Інгушэціі апыталі мноства чачэнскіх бежанцаў, якія сьцьвярджаюць, што бачылі целы ахвяраў ці гутарылі з жанчынамі, якіх гвалцілі.

Па словах жанчыны, якая ў дакладзе HRW пазначана як «Маліка», 19 сьнежня мінулага году ў Шалі расейскія салдаты згвалцілі і забілі яе суседку, 23-гадовую «Фіру» (імя таксама зьмененае). Салдаты пры гэтым таксама забілі яе 60-гадовую сьвякроў. «Фіра» была на 5-6 месяцы цяжарасьці.

Па яе словах, яна і іншыя суседзі, перад тым, як знайсьці целы, чулі крыкі з дому, плач і стрэлы. HRW мае сапраўдныя імёны ахвяраў і сьведкаў, але «Маліка» просіць іх не называць.

«Маліка» ўдзельнічала ў абмываньні целаў перад хаўтурамі і добра бачыла характэрныя сінякі на целе «Фіры», яе скусаныя вусны і шыю, што недвухсэнсоўна кажа пра сэксуальны гвалт, а таксама дзірачку ад кулі справа на галаве і вялікую рану зьлева.

HRW атрымала падобныя сьведчаньні пра гвалт ў сяле Алхан-Юрт у сярэдзіне сьнежня, дзе таксама былі масавыя катаваньні, марадзёрства і іншыя сур'ёзныя злачынствы.

Працяг на стар. 8



vytoki.net

# Расейскія салдаты...

Пачатак на стар. 7

«Зэйнап», 32-гадовая жыхарка Алхан-Юрта, паведаміла назіральнікам імёны двух жанчын, якіх згвалцілі расейскія салдаты на пачатку сьнежня. Адной зь іх 25 год, яна замужам, другая - не замужам, ёй 21 год, і «Зэйнап» добра яе ведае. Па яе зьвестках, сваякі зьбіраюцца накіраваць пацярпелую маладую жанчыну ў Казахстан, каб яна змагла прыйсьці ў сябе.

«Зэйнап» кажа, што салдаты часта былі п'янымі і патрабавалі ад жыхароў вёскі гарэлкі і маладых жанчын са словамі: «У нас даўна не было жанчын, нам трэба жанчыны». Па словах «Зэйнап», магчыма, выпадкаў гвалту было болей, але людзі маўчаць.

Гэта пацьвярджае другая жыхарка Алхан-Юрта, 55-гадовая «Заман». Па яе словах, ахвярамі сталі пяць ці шэсьць жанчын, уключаючы адну аднагодку «Заман». Многія людзі, кажа яна, адмаўляюцца паведамляць што-небудзь пра гвалт, таму што гэтым жанчынам яшчэ давядзецца выходзіць замуж. «Заман» таксама распавяла, што ёй і яе суседзям давялося некалькі дзён хаваць дарослых дачок у выкапанай падземнай нары, каб уберагчы іх ад гвалту.

Трэцяя сьведка з Алхан-Юрта, 40-гадовая «Султан» распавяла HRW, як сямёра кантрактнікаў згвалтавалі 42-43-гадовую жанчыну, якая жыла на малалюднай часткы вёсцы. Перад гэтым яны выкінулі з дому на вуліцу яе мужа. «Я ведаю яе імя, — кажа «Султан», — але гэта супраць нашых звычаяў - называць яе».

Паведамленьні пра выпадкі гвалту ў Чачні ўсплываюць насуперак жорсткаму табу, гаворыцца ў дакладзе HRW. Мусульманская культура і чачэнскія традыцыі строга рэгулююць адносіны паміж паламі, і неадпаведныя паводзіны выклікаюць жорсткае пакараньне.

Згвалтаваньні ў зоне баявых дзеяньняў, нагадвае HRW, адносяцца да шэрагу ваенных злачынстваў.У апошнія гады міжнародныя трыбуналы па былой Югаславіі і Руандзе вынесьлі некалькі абвінаваўчых выракаў вінаватым у падобных злачынствах.





# Хадыка Юры Віктаравіч

*Нарадзіўся 23 чэрвеня 1938 г. у Менску. Скончыў БДУ (1960). Доктар фізыка-матэматычных навук (1976), прафэсар (1981). Кандыдат мастацтвазнаўства. Аўтар кніг «На пути в космос» (у сааўт., 1963), «Воздействие мощных потоков излучения на металлы» (у сааўт., 1970), «Непаўторныя рысы. З гісторыі беларускага партрэту» (1992), «Сьветапоглядныя асновы дэмакратычнага руху» (1993), двух разьдзелаў у «Гісторыі беларускага мастацтва» (т.II, 1986). У 1960-1989 гг. малодшы навуковы, ст. навуковы супрацоўнік, заг. лябараторыі Інстытуту фізыкі АН БССР. З чэрвеня 1989 г. намесьнік старшыні БНФ «Адраджэньне». Жанаты, мае двух сыноў. Захапленьні: у 1969-1980 гг. удзельнічаў у зборы матар'ялаў для шматтомнага выданьня «Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі», у зборы і апрацоўцы экспанатаў для Музэю старажытнабеларускай культуры пры Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклёру НАН Беларусі.*



# Заява Віцебскай гарадзкой рады Партыі БНФ

З прыходам да ўлады А. Лукашэнкі пачаўся беспрэцэдэнтны ўціск на прадпрымальнікаў. Яны не падабаюцца ўладзе сваёй незалежнай эканамічнай дзейнасьцю. Лукашызму не патрэбны незалежныя свабодныя людзі, якія ня ходзяць з працягнутай рукой, а самі ствараюць рабочыя месцы й самі зарабляюць сабе на жыцьцё. У кожнай нармальнай краіне такія прадпрымальныя людзі ёсьць аснова дабрабыту грамадзтва й падмурак стабільнасьці дзяржавы. Прадпрымальнікі Віцебшчыны сваімі выплатамі фармуюць каля 20 % бюджэту. Нягледзячы на гэта рэжым Лукашэнкі з пачатку 2000 г. вырашыў іх канчаткова задушыць эканамічна новымі паборамі. Ня ведаючы, адкуль дастаць грошы на існаваньне, беларуская ўлада мае намер выцягнуць апошняе з кішэні прадпрымальнікаў, пазбавіўшы іх абаротных сродкаў. Для рэжыму прадпрымальнікі ня людзі, а "вшивые блохи". БНФ увесь час свайго існаваньня выступаў за шырокае развіцьцё прадпрымальніцтва ў Беларусі. Наша партыя даўна распрацавала эканамічную праграму, але ўладзе не патрэбная гэтая праграма, як і самі прадпрымальнікі. Мы падтрымліваем удзельнікаў страйку ды іхныя справядлівыя патрабаваньні. Хай жыве і квітнее прыватны бізнэс у Беларусі.

*Прынята на паседжаньні*
*Віцебскай гарадзкой рады*
*Партыі БНФ*
*31 студзеня 2000 г.*

НавінЫ
БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА ФРОНТУ "АДРАДЖЭНЬНЕ"
№ 2 (19), люты 2000 г, наклад 299 асобнікаў
Распаўсюджваецца бясплатна на правах унутранай дакумэнтацыі.

У нумары скарыстаная выява Пагоні з тытульнага аркуша Статута Вялікага Княства Літоўскага 1588 г.
Адрас для ліставаньня: 220006, Менск, а/с 27, тэл. 284-50-12
E-mail: bpf_news@politician.com
в.а. рэдактара Віктар Івашкевіч



vytoki.net